# Год кнігі: дасягненні і праблемы



Ігар ЛАПЦЁНАК,
пісьменнік

**У наш час інфармацыйны паток пастаянна пашыраецца, расце ўплыў слова на развіццё грамадскіх працэсаў у Беларусі і ва ўсім свеце. Нездарма ў пачатку мінулага года кіраўніком нашай дзяржавы і Саюзам пісьменнікаў Беларусі было ініцыявана прыняцце Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб абʼяўленні 2012 года Годам кнігі». Гэта сведчыць аб зацікаўленасці дзяржавы і грамадства ў павышэнні ролі кнігі. 27 студзеня 2012 года Савет Міністраў Беларусі зацвердзіў пастанову аб прыняцці Рэспубліканскага плана мерапрыемстваў па правядзенні ў 2012 годзе Года кнігі. Работа па выкананні плана вялася пастаянна і мэтанакіравана.**

Знамянальна, што Год кнігі супаў з юбілеямі беларускіх пісьменнікаў, якія зрабілі неацэнны ўклад у развіццё айчыннай літаратуры. Мы святкавалі 130-годдзе з дня нараджэння нашых выдатных класікаў Янкі Купалы і Якуба Коласа, 100-годдзе з дня нараджэння Максіма Танка. А яшчэ ўпрыгожыла каляндар года такая важная падзея, як 1150-годдзе старажытнага Полацка. Гэта зямля спарадзіла нашых духоўных апосталаў: Францыска Скарыну, Еўфрасінню Полацкую, Сімяона Полацкага. І Год кнігі быў азораны іх светлымі імёнамі. Мабыць, будзе дарэчы прыгадаць яшчэ адзін юбілей: сучаснага папулярнага пісьменніка Мікалая Чаргінца, які адзначыў 75-годдзе.

Рэалізацыя мерапрыемстваў у рамках Года кнігі павінна была павысіць значнасць і ролю кнігі як інструмента атрымання інфармацыі і ведаў ва ўмовах развіцця інфармацыйнага грамадства, падтрымаць кнігавыданне, актывізаваць прапаганду айчыннай літаратуры. Год кнігі даў новы штуршок развіццю цікавасці да кнігі, павысіў яе статус, спрыяў культурнаму, палітычнаму, сацыяльнаму і эканамічнаму развіццю нашай краіны, аказаў станоўчы ўплыў на выдавецкую, паліграфічную і кнігагандлёвую галіны, стварыў добрую магчымасць дзеля іх умацавання і развіцця.

У 2012-м багата што зроблена для папулярызацыі беларускай літаратуры. Але ёсць яшчэ рэзервы, задумы, якія чакаюць свайго практычнага ажыццяўлення, бо клопат і цікавасць да кнігі нельга абмежаваць адным годам. Распрацаваны і прыняты Палатай прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь праект Закона «Аб выдавецкай справе ў Рэспубліцы Беларусь», зацверджаны мінімальныя стаўкі аўтарскага ўзнагароджання пісьменнікам, складальнікам, перакладчыкам, мастакам, фатографам – тым, хто непасрэдна стварае кнігу.

Сёння ў нашай краіне выдавецкай справай займаецца амаль 700 субʼектаў гаспадарання. На жаль, не ўсе яны аднолькава актыўна ўдзельнічаюць у кнігавыдавецкім бізнесе. Значную частку складаюць дробныя прадпрыемствы і структуры, для якіх выдавецкая дзейнасць, шчыра скажам, не зʼяўляецца асноўнай. Актыўна дзеючых устаноў, якія выдалі ад 11 да 50 назваў, каля 90, толькі 35 выпусцілі ад 51 да 100, а 20 – ад 101 да 400 назваў. Сярод апошніх «Аверсэв», «Белы вецер», «Папуры», «Нацыянальны інстытут адукацыі», «Тэтрасістэм», дзяржаўныя выдавецтвы «Народная асвета», «Вышэйшая школа»,

## ПРА АЎТАРА

ЛАПЦЁНАК Ігар Мікалаевіч.

Нарадзіўся ў 1947 годзе ў Мінску. У 1971 годзе скончыў Мінскі інстытут замежных моў, у 1979 годзе – Мінскую ВПШ, аспірантуру пры Мінскім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя А.М. Горкага. Працаваў перакладчыкам у складзе місій савецкіх спецыялістаў у краінах Афрыкі. У 1973–1974 гадах служыў у Савецкай арміі.

З 1975 года – у выдавецкай сістэме краіны, працаваў у выдавецтвах «Вышэйшая школа», «Беларусь». З 1990 года – дырэктар выдавецтва «Народная асвета». Прафесар факультэта журналістыкі БДУ (2006–2011). З 2003 па 2011 год – намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Член Саюза пісьменнікаў і Саюза журналістаў Беларусі.

Аўтар шэрагу навуковых прац па развіцці кнігавыдання ў Беларусі.



«Выдавецкі дом «Беларуская навука», асобныя ВНУ.

Найбуйнейшым у краіне па аб'ёмах вытворчасці застаецца прыватнае выдавецтва «Харвест», якое працуе сумесна з расійскімі партнёрамі: у 2011 годзе ім выдадзена 1848 назваў кніг. Дзякуючы «Харвесту» мы паспяхова ажыццяўляем праект па выпуску грунтоўнай серыі кніг «Бібліятэка Саюза пісьменнікаў Беларусі», першых кніг маладых аўтараў, серыйныя выданні дэтэктыўнай і прыгодніцкай літаратуры.

Паводле даных дзяржаўнага статыстычнага ўліку, у апошнія гады зберагаецца ўстойлівая тэндэнцыя: пры захаванні прыкладна аднаго ўзроўню па колькасці назваў (каля 12 000 у 2011 годзе пры тыражы 34,34 млн экзэмпляраў) значна памяншаецца тыраж выданнаў (для параўнання – у 2008 годзе выйшла 13 210 назваў агульным тыражом 55,4 млн экзэмпляраў), пры гэтым на беларускай мове ў 2011 годзе надрукавана 940 назваў тыражом 2,9 млн экзэмпляраў, а ў 2008 – 879 і 3,05 млн адпаведна. Па дзяржаўных выдавецтвах статыстыка такая: 2011 год – 524 назвы тыражом 1,99 млн экзэмпляраў (2008 год – 480 назваў пры тыражы 4,7 млн). Пры гэтым прадукцыя дзяржвыдавецтваў у агульным аб'ёме займае 4,6 % па назвах і 5,4 % па тыражы.

У краіне існуе дзяржаўны заказ на выданні, які штогод рыхтуецца Міністэрствам інфармацыі Беларусі на падставе прапаноў выдавецтваў, зацікаўленых міністэрстваў і арганізацый і які ўзгадняецца на розных узроўнях, пры гэтым пералік выданняў беларускіх пісьменнікаў фарміруецца з улікам прапаноў Саюза пісьменнікаў Беларусі і ўзгадняецца з Адміністрацыяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. У пералік сацыяльна значнай літаратуры ўключаюцца кнігі, выданне якіх ажыццяўляецца па даручэнні кіраўніка дзяржавы і Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, з нацыянальных і дзяржаўных праграм, прысвечаныя тэматыцы года, па гісторыі, эканоміцы і культуры Беларусі. Але пры гэтым неабходна адзначыць, што не ў поўным аб'ёме ўлічваюцца прапановы бібліятэк па выпуску кніг для дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту, літаратуразнаўчых выданняў, галіновай літаратуры. Тут паўстае неабходнасць больш цеснага супрацоўніцтва Саюза пісьменнікаў Беларусі і бібліятэк, іх дзейснага ўплыву на фарміраванне планаў выпуску літаратуры. Кажучы пра дзяржаўную падтрымку нацыянальнага кнігавыдання, варта прывесці такую лічбу: у 2012 годзе ў нашай краіне на гэта выдзелена 10,7 млрд рублёў.

Субсідыі на выпуск выданняў на беларускай мове складаюць часцей за ўсё да 50 % (для дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту – да 60 % адпускной цаны выдавецтва з улікам ПДВ), на рускай мове – да 30 %. І толькі на вельмі значныя выданні – да 100 %. Пры гэтым сацыяльна значная літаратура складае ў аб'ёме выпуску прадукцыі дзяржаўных выдавецтваў да 20 %, а ў агульны аб'ёме па краіне – менш за 1 %.

На жаль, у апошнія гады пры значным росце кошту паліграфматэрыялаў і паслуг адбываецца памяншэнне колькасных паказчыкаў выпуску сацыяльна значнай літаратуры. Так, у 2006 годзе пры аб'ёме фінансавання 1,24 млн долараў было выдадзена 147 назваў, у 2008 – пры практычна аналагічным аб'ёме фінансавання (1,17 млн долараў) – 131, у 2011 пры фінансаванні 1,33 млн долараў – толькі 95 назваў, з якіх 26 – кнігі шрыфтам Брайля.

Як станоўчую тэндэнцыю адзначым, што ў 2012 годзе, у адпаведнасці з даручэннем кіраўніка дзяржавы, агучаным на сустрэчы з пісьменнікамі, у план выпуску сацыяльна значнай літаратуры ўпершыню за апошнія 10 гадоў былі ўключаны 11 назваў літаратурна-мастацкіх твораў беларускіх аўтараў для мэтавай пастаўкі ў публічныя бібліятэкі. Рыхтуюцца спісы падобных выданняў і на 2013 год. Усё гэта – важная падтрымка пры фарміраванні бібліятэчных фондаў, багаццем і разнастайнасцю якіх мы пакуль што пахваліцца не можам.

Мабыць, да месца ўзгадаць, што кнігі беларускіх дзяржаўных выдавецтваў пастаянна адзначаюцца высокімі ўзнагародамі на нацыянальных і міжнародных конкурсах. Так, па выніках Міжнароднага конкурсу «Мастацтва кнігі» дзяржаў – удзельніц СНД, які адбыўся ў маі 2012 года ў Астане, нашы выдаўцы атрымалі 7 дыпломаў (больш, чым выдаўцы іншых краін), у тым ліку ўзялі і Гран-пры. Адзначу, што за дзевяцігадовую гісторыю гэтага конкурсу ў Беларусь адправіліся 69 дыпломаў, у тым ліку чатыры Гран-пры.

Але сучасныя кнігавыдаўцы сутыкнуліся з праблемай, якой не было гадоў дваццаць таму. Маецца на ўвазе рэалізацыя літаратуры. Беззваротна мінуў час, калі кнігалюбы стаялі ў чарзе, каб займець падпіску на творы любімага пісьменніка, набывалі кнігі за талоны ад здадзенай макулатуры. Сёння прапанаванне літаратуры перавышае попыт на яе. У дадатак, з'явіліся электронныя сродкі інфармацыі, якія набываюць усё большую папулярнасць.

Пытанні рэалізацыі сацыяльна значнай літаратуры, у першую чаргу камплектавання бібліятэк, знаходзяцца пад пастаянным кантролем міністэрстваў інфармацыі, культуры і адукацыі Рэспублікі Беларусь, якія штоквартальна зацвярджаюць пералік выданняў, рэкамендаваных для закупкі, праводзяць маніторынг аб'ёмаў неабходнага тыражу. Менавіта тут, на наш погляд, адкрыта шырокая прастора для дзейнасці, бо, з аднаго боку, бачны сур'ёзныя пралікі ў маркетынгавай палітыцы выдавецтваў, а з другога – недапрацоўкі. Датычацца яны, у першую чаргу, недастатковай прапагандысцкай работы як з боку саміх літаратараў, так і СМІ. Можна спаслацца на шматлікія сустрэчы нашых пісьменнікаў з чытачамі ў школах, ва ўстановах, на прадпрыемствах, але, шчыра кажучы, гэта кропля ў моры. Колькі чытачоў бывае на такіх сустрэчах? 10, 20, ну, можа, 30. Калі памножым на колькасць сустрэч, то атрымаем вельмі сціплую лічбу. А насельніцтва краіны – больш за 9,5 млн чалавек. Да таго ж, як праходзяць гэтыя сустрэчы?! З большага – размова пра сябе, аўтара, а не пра стан літаратуры і праблемы кнігавыдання і прапаганды кнігі. Я нават і не згадваю пра тыя праграмы аб літаратуры на нашым тэлебачанні, якія канулі ў Лету. Ёсць сціплыя намаганні газет «ЛіМ» і «Советская Белоруссия», ды вельмі рэдкія згадкі ў іншых СМІ, як, напрыклад, на Беларускім радыё.

Трывожыць стаўленне нацыянальнага тэлебачання (практычна ўсіх каналаў) да літаратуры. На вялікі жаль, насуперак намаганням Саюза пісьменнікаў Беларусі, не могуць наладзіцца адносіны з Белтэлерадыёкампаніяй. На экранах беларускага тэлебачання маюць месца адзінкавыя перадачы з удзелам літаратараў. Пры гэтым выклікае здзіўленне і падбор удзельнікаў такіх сустрэч. Часам там можна ўбачыць пасрэдных словатворцаў з апазіцыйнага Саюза беларускіх пісьменнікаў.

Супраць Саюза пісьменнікаў Беларусі актыўна выступае апазіцыйная прэса, якая неаднаразова па-дылетанцку і абразліва выказвалася ў іх адрас. Сугучна гэта і злосным «развагам» замежных радыёгаласоў.

Галоўнай пляцоўкай сустрэч пісьменнікаў з чытачом з'яўляецца бібліятэка – ачаг культуры, месца выхавання і адукацыі насельніцтва. Многае залежыць ад зладжанай работы бібліятэк, а іх у нашай краіне каля 10 000. Міністэрства інфармацыі адзначае, што апошнім часам наладзілася актыўнае і канструктыўнае супрацоўніцтва выдавецтваў і бібліятэк па камплектаванні фондаў сацыяльна значнай літаратуры. Вынікам стала павелічэнне аб'ёмаў закупак кніжнай прадукцыі дзяржаўных выдавецтваў. За першае паўгоддзе 2012 года публічныя бібліятэкі закупілі 53 182 экзэмпляры сацыяльна значных кніг на суму 2 087 млн рублёў. Але дэталёвы аналіз паказвае, што сацыяльна значная літаратура, якая выдаецца тыражом усяго 1,5–2 тыс. экзэмпляраў, практычна не даходзіць да сельскіх бібліятэк, аграгарадкоў, адсутнічае ў бібліятэках ведамаснага падпарадкавання. Так, у астатках знаходзіцца 29 назваў, выдадзеных у 2011 годзе з выкарыстаннем бюджэтных сродкаў, на суму 861 млн рублёў, што складае 13 % ад агульнай колькасці назваў і 15 % ад сумы астаткаў. Не цалкам рэалізаваны тыражы збору твораў І. Шамякіна (выдаецца па распараджэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь), энцыклапедый «Культура Беларусі» (1082 экзэмпляры ў астатках), «Гісторыя беларускай кнігі» (700 экзэмпляраў), «Археалогія Беларусі» (684 экзэмпляры), «Максім Багдановіч» (465 экзэмпляраў). Паводле інфармацыі аблвыканкамаў, на набыццё сацыяльна значнай літаратуры ў сярэднім выдаткоўваецца ад 7 да 20 % ад агульнай сумы сродкаў, прадугледжаных для папаўнення кніжных фондаў. Відаць, настаў час, калі пералік сацыяльна значнай літаратуры павінен быць абавязковым. На наш погляд, фінансавых сродкаў на закупку літаратуры ў абласцях дастаткова.

У Год кнігі большай увагі патрабавала вырашэнне пытання распаўсюджвання кніжнай прадукцыі праз гандлёвыя сеткі Беларусі. Сёння існуе падведамная Мінінфар-

му сетка ААТ «Белкніга», якая аб’ядноўвае 75 гандлёвых аб’ектаў. З агульнай колькасці згаданых кнігарняў 45 знаходзяцца ў Мінску і абласных цэнтрах, 26 – у раённых гарадах і 4 – у пасёлках гарадскога тыпу. Паўнавартасная кнігарня ёсць далёка не ў кожным райцэнтры, што не дае магчымасці ў поўным аб’ёме задавальняць патрэбы насельніцтва. Неабходна актывізаваць гандаль кніжнай прадукцыяй, у тым ліку сацыяльна значнай літаратурай, у сістэме спажывецкай кааперацыі, іншых гандлёвых сетках. Адзначым, што ў сістэме спажывецкай кааперацыі ёсць 44 кнігарні. Выходзіць, у многіх райцэнтрах іх зусім няма. Вельмі актуальным з’яўляецца пытанне падрыхтоўкі кваліфікаваных кнігагандляроў. Выклікае жаль адсутнасць у некаторых з іх мэтанакіраванага жадання прапаноўваць, папулярызаваць тую ці іншую прадукцыю. Значна прасцей выкласці стос кніг на паліцы і спадзявацца, што чытач сам адшукае патрэбнае.

У Беларусі зарэгістравана каля 140 дзяржаўных перыядычных выданняў, з іх 9 абласных, 9 гарадскіх і 118 раённых і аб’яднаных газет з разавым тыражом каля 1 млн экзэмпляраў, а таксама 243 тэле- і радыёпраграмы: 162 праграмы радыёвяшчання, з якіх 139 дзяржаўнай уласнасці, і 81 праграма тэлевяшчання, з якіх 31 – у дзяржаўнай уласнасці. Расце папулярнасць Інтэрнэта як крыніцы атрымання інфармацыі. На жаль, гэтыя магчымасці па прапагандзе кнігі выкарыстоўваюцца недастаткова.

Год кнігі зрабіў відавочны ўклад у прапаганду літаратуры, павысіў цікавасць да яе з боку чытачоў. Саюз пісьменнікаў Беларусі, Міністэрства інфармацыі, Міністэрства культуры, Міністэрства адукацыі, а таксама іншыя ўстановы праявілі творчую актыўнасць, правялі нямала мерапрыемстваў, у якіх выявіліся новыя падыходы ў рабоце па прапагандзе беларускай літаратуры. Будзем спадзявацца, што гэтыя захады не спыняцца з завяршэннем 2012 года.



## К СВЕДЕНИЮ АВТОРОВ

Требования к оформлению научных публикаций составлены в соответствии с главой 5 Инструкции по оформлению диссертации, автореферата и публикаций по теме диссертации, утвержденной постановлением президиума Высшего аттестационного комитета Республики Беларусь от 24.12.1997 года № 178 (в редакции постановления Высшей аттестационной комиссии Республики Беларусь от 22.02.2006 года № 2).

**Условия приема авторских материалов в журнал «Беларуская думка»**

1. Принимаются рукописи, ранее не публиковавшиеся.
2. Редакция принимает рукописи в двух экземплярах (не ксерокопия), напечатанные шрифтом Times New Roman, 14-й кегль, межстрочный интервал – полуторный, объем статьи – до 10 страниц.
3. Статья должна содержать:
- индекс УДК;
- фамилию, имя, отчество автора (авторов), название статьи на русском и английском языках;
- резюме объемом 400–450 знаков на русском или английском языках;
- введение (с поставленными задачами), основную часть, заключение (с четко сформулированными выводами);
- список цитированных источников, оформленный в соответствии с требованиями ВАК Республики Беларусь.

4. Материал визируется автором.
5. Наличие электронного варианта статьи (дискета, компакт-диск, флеш-носитель).
6. Иллюстративный материал предоставляется отдельными графическими файлами.
7. Данные об авторе (0,5–1 страница): телефон, адрес электронной почты, место работы, должность, ученая степень, звание, сфера научных интересов.
8. Рецензия (внешняя или внутренняя).

Материалы, в которых не соблюдены перечисленные условия, не принимаются к рассмотрению редакцией. Рукописи не рецензируются и не возвращаются.

Редакция оставляет за собой право осуществлять отбор, дополнительное рецензирование и редактирование статей.